105 лет
БГПУ

Министерство образования Республики Беларусь

Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка

Институт повышения квалификации и переподготовки

# ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ОБРАЗОВАНИЕ ВЗРОСЛЫХ: МЕЖДУНАРОДНЫЕ ТЕНДЕНЦИИ И НАЦИОНАЛЬНЫЕ ПРИОРИТЕТЫ

*Сборник научных статей*
*Международной научно-практической конференции,*
*посвященной 105-летию БГПУ*

*Минск, 22–23 ноября 2019 г.*

Минск
БГПУ
2019

УДК 37.018.46
ББК 74.4
Д68

Редакционная коллегия:
*Шеститко И.В., Радыгина В.В., Клезович О.В., Кислякова Ю.Н.*

Научный редактор:
*Стрелкова И.Б.*, кандидат педагогических наук, доцент

Рецензенты:
*Торхова А.В.*, доктор педагогических наук, профессор
*Зеленко О.В.,* доктор педагогических наук, доцент

Д68 **Дополнительное** образование взрослых: международные тенденции и национальные приоритеты : сборник научных статей Международной научно-практической конференции, посвященной 105-летию БГПУ, Минск, 22–23 ноября 2019 г. / Белорус. гос. пед. ун-т имени Максима Танка ; редкол.: И. В. Шеститко [и др.] ; науч. ред. И. Б. Стрелкова. – Минск : БГПУ, 2019. – 300 с.
ISBN 978-985-541-689-1.

В сборник включены статьи участников Международной научно-практической конференции «Дополнительное образование взрослых: международные тенденции и национальные приоритеты».

Издание представляет теоретический и практический интерес для широкого круга учёных и специалистов в области дополнительного профессионального образования взрослых, инклюзивного образования, проектной деятельности, наукометрии, информационных технологий; преподавателей, аспирантов, магистрантов и студентов, а также для всех, кто интересуется инновациями и основными тенденциями развития дополнительного образования взрослых в Республике Беларусь и за рубежом.

Авторы несут ответственность за достоверность представленной информации.

**УДК 37.018.46**
**ББК 74.4**

**ISBN 978-985-541-689-1**

© Оформление. БГПУ, 2019

УДК [37.016:808.5]:373.3

# ФАРМІРАВАННЕ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ У ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ СРОДКАМІ ФАЛЬКЛОРУ

*Шылава Алена Савельеўна,*
*Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі*
*Беларускага дзяржаўнага педагагічнага*
*ўніверсітэта імя Максіма Танка,*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*nigr@tut.by*

*Мурашка Наталля Уладзіміраўна,*
*Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі*
*Беларускага дзяржаўнага педагагічнага*
*ўніверсітэта імя Максіма Танка,*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*m6556598@yandex.ru*

*Праблема фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць пошуку і ўкаранення новых падыходаў і інтэнсіўных адукацыйных тэхналогій, якія спрыяюць эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечваюць дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці, а таксама фарміраванню вучэбнай дзейнасці малодшых школьнікаў.*

*Ключавыя словы: камунікатыўная кампетэнцыя, камунікатыўныя уменні, фальклор, тэхналогія калектыўнага ўзаеманавучання.*

# FORMATION OF COMMUNICATIVE COMPETENCE YOUNGER STUDENTS IN THE PROCESS OF LEARNING BY MEANS OF FOLKLORE

*Alena Shilava,*
*Institute for Advanced Studies and Retraining*
*of the Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank,*
*Minsk, Republic of Belarus*
*nigr@tut.by*

*Natallia Murashka,*
*Institute for Advanced Studies and Retraining*
*of the Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank,*
*Minsk, Republic of Belarus*
*m6556598@yandex.ru*

*The problem of formation of communicative competence at the 1st stage of General secondary education causes the need to find and implement new approaches and intensive educational technologies that contribute to the effective assimilation of knowledge and ensure the achievement of pre-designed results based on the interaction of actors, as well as the formation of educational activities of younger students.*

*Key words: communicative competence, communication skills, folklore, technology of collective mutual learning.*

Фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі ў малодшых школьнікаў з'яўляецца актуальнай праблемай у сучаснай педагагічнай практыцы. Камунікатыўная кампетэнцыя ўплывае не толькі на выніковасць навучання дзяцей, але і на працэс развіцця асобы ў цэлым.

Паняцце кампетэнцыя, прынятая навуковай супольнасцю дзякуючы працам амерыканскага лінгвіста Н. Хомскага, выкарыстоўваецца ў методыцы выкладання мовы пры вызначэнні агульных і прыватных мэтаў і зместу навучання [1].

Пад «камунікатыўнай кампетэнцыяй» мы разумеем здольнасць і рэальную гатоўнасць да зносін адэкватна мэтам, сферам і сітуацыям зносін, гатоўнасць да маўленчага ўзаемадзеяння і разумення [2, с. 27]. Як адзначае А.А. Быстрова, камунікатыўная кампетэнцыя складаецца з ведаў аб моваведчых паняццях і камунікатыўных ўменнях.

Камунікатыўныя ўменні – гэта сукупнасць простых уменняў, такіх як уменне вусна і пісьмова перадаваць інфармацыю, уменне прымаць інфармацыю з патрэбным сэнсам, уменне слухаць, уменне разумець іншага, якія неабходны дзіцяці для зносін, навучання, узаемадзеяння ў калектыве, а таксама развіцця асобы.

Пад «уменнямі» мы разумеем падрыхтаванасць да практычных і тэарэтычных дзеянняў, выконваемых хутка, дакладна, свядома, на аснове засвоеных ведаў і жыццёвага вопыту. Уменні фарміруюцца шляхам практыкаванняў і ствараюць магчымасць выканання дзеяння не толькі ў звыклых, але і ў новых умовах [3].

Фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі ў малодшым школьным узросце найбольш проста праходзіць у працэсе сюжэтна-ролевай гульні як найбольш дакладнай і даступнай мадэлі зносін.

Паспяховасць і эфектыўнасць фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў залежаць ад уліку ўзроставых асаблівасцяў, ад выкарыстання характэрных для дадзенага перыяду відаў дзейнасці, ад накіраванасці працы настаўніка на фарміраванне ўсіх камунікатыўных уменняў і ад атмасферы, у якой непасрэдна адбываецца працэс фарміравання.

На сёняшні дзень педагогі і псіхолагі шукаюць спосабы актывізацыі патрэбнасці ў зносінах і маўленчай камунікацыі паміж вучнямі. Сродкамі па фарміраванню камунікатыўнай кампетэнцыі, і як след, камунікатыўных уменняў і маўлення, у малодшых школьнікаў сучасныя даследчыкі лічаць гульнёвыя практыкаванні, сюжэтна-ролевыя гульні. Лічыцца, што пад час гульнёвай дзейнасці вучні аб'ядноўваюцца ў гульнёвыя калектывы, пераймаюць адзін у аднаго існуючыя веды. Неабходнасць весці размову з

аднагодкамі стымулюе развіццё звязанага маўлення, асабліва дыялагічнага. Дыялог як найбольш натуральная форма маўленчай дзейнасці прадугледжвае наяўнасць пастаяннай зваротнай сувязі, падмацавання з боку партнёра.

Новыя даследаванні ў галіне псіхалогіі і педагогікі ў якасці сродкаў фарміравання камунікатыўных уменняў і маўлення ў вучняў называюць народную цацку, казкі, легенды. А ўсё гэта, у сваю чаргу, з'яўляецца часткай фальклору.

Пад тэрмінам «фальклор» мы разумеем народную творчасць, светапогляд народа, сістэму каштоўнасцей і сістэму выхавання маладога пакалення.

Фальклор заўседы натуральным чынам уваходзіў у этнапедагогіку. Педагагічная накіраванасць песень, гульняў, казак і ўсяго таго свету, у якім жыло дзіця і дзе фарміравалася яго асоба, – відавочна. Вусная народная творчасць, песні, гульні, святы, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, традыцыі і звычаі – усё гэта кампаненты народнай педагогікі, якія даступны дзецям па змесце, па форме ажыццяўлення. Фальклорныя творы нясуць у сабе пэўныя вобразы, яны даступны і цікавы дзецям. Каштоўнасць фальклору як педагагічнага сродку вызначаецца:

– натуральным, беспрымусовым уздзеяннем на дзяцей дзякуючы сродкам выразнасці;
– даступнасцю для дзяцей з розным узроўнем развіцця;
– стымуляваннем развіцця творчых здольнасцей асобы;
– эмацыянальна-эстэтычнай пераемнасцю паміж дарослымі і дзецьмі.

Акрамя таго, у фальклорнай традыцыі няма падзелу на выканаўцаў і гледачоў таго ці іншага акта творчасці, а ўсе прысутныя з'яўляюцца яго ўдзельнікамі і стваральнікамі. Гэты працэс з'яўляецца вельмі істотным, паколькі здымаецца механізм ацэньвання, дзіця разнявольваецца, і сам працэс яго ўдзелу ў песні, танцы, гульні надзяляецца сэнсам.

Здаўна маладое пакаленне вучылася на вуснай народнай творчасці продкаў, чэрпала з яе веды аб маральнасці, узаемаадносінах паміж людзьмі, духоўнасці. Спадчына пакаленняў дайшла і да сённяшняга дня. Большасць твораў вуснай народнай творчасці існуе ў вершаванай форме, якая дазваляе іх добра завучваць на памяць і перадаваць у вуснай форме.

Работа настаўніка з эпічнымі творамі па фарміраванні камунікатыўнай кампетэнцыі, у правatнасці камунікатыўных уменняў, можа быць разнастайнай:

– чытанне;
– разбор і абмеркаванне;
– драматызацыя;
– сачыненне казак і легенд вучнямі;
– творчая выяўленчая праца (маляванне, лепка з пластыліну і г. д.).

Не менш важную ролю ў фарміраванні камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў належыць і малым жанрам вуснай народнай творчасці. Работа настаўніка з імі можа насіць фрагментарны, але ў той жа час сістэматычны характар. Трэба адзначыць, што карысць ад такой працы будзе велізарная. Прыказкі і прымаўкі, загадкі, скорагаворкі, пацешкі і небыліцы тым і добрыя для фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі, што яны лёгка, натуральна, у гульнёвой форме развіваюць вербальнаю камунікацыю. Формы работы могут быць наступнымі:

– практыкаванні па пашырэнню слоўнікавага запасу;
– узаемныя дыктоўкі;
– практыкаванні па пастаноўцы маўлення;
– спаборніцтвы;
– гульні з малымі формамі.

Вялікія патэнцыяльныя магчымасці для фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі заключаюцца ў фальклорных песнях і танцах, гульнях, святах і абрадах і г.д.

Разглядаючы фальклорны матэрыял як патэнцыял для развіцця камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў, нельга не закрануць педагагічны аспект пытання. У педагагічным плане фальклорны матэрыял таксама дае нам вялікія магчымасці. Фальклор мае сувязь з жыццём, ён выхоўвае і развівае, даступны і зразумелы для вучняў, а таксама наглядны. Вывучаючы фальклорныя матэрыялы, напрыклад, паводле «народнага календара» (восеньскі, зімовы, вясновы, летні цыклы) выконваецца прынцып сістэмнасці і паслядоўнасці. Фальклор дае нам магчымасць выбару формаў работы: індывідуальныя, групавыя, калектыўныя. Гульнёвая і творчая дзейнасць, якую прадугледжвае фальклорны матэрыял, дапамагае забяспечыць актыўнасць і свядомасць удзелу навучэнцаў у працэсе навучання, што абавязкова вядзе да трываласці вынікаў навучання.

У сучаснай школе на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі фальклорны матэрыял для фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі магчыма выкарыстоўваць як у вучэбнай, так і ў пазавучэбнай дзейнасці.

Сучасная адукацыя накіравана на эфектыўны пошук шляхоў, якія б спрыялі фарміраванню камунікатыўнай кампетэнцыі ў малодшых школьнікаў, і, так сама, на выкарыстанне інтэнсіўных адукацыйных тэхналогій.

Адной з эфектыўных інтэнсіўных тэхналогій у галіне фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі можа быць тэхналогія калектыўнага ўзаеманавучання [4, с. 41] або калектыўны спосаб навучання А.Р. Рывіна, В.К. Дзьячэнка. Асноўная ідэя заключаецца ў тым, што ўсе навучэнцы навучаюць кожнага, і кожны навучае ўсіх. У структуру калектыўнага спосабу арганізацыі навучання ўваходзіць: работа вучня з крыніцай ведаў,

індывідуальная работа вучня з настаўнікам, работа ў групе аднагодкаў, узаемнае навучанне [5, с. 22].

У кнізе «Вучым радасна, паспяхова, з цікавасцю і ўсмешкай» у рамках гэтай тэхналогіі настаўнікам пачатковых класаў для выкарыстання ў вучэбнай дзейнасці прапануюцца наступныя віды работ, прызначаныя для работы ў парах:

– работа па напісанню ўзаемных дыктантаў,
– сумесная праверка дамашняга задання,
– работа па падрыхтоўцы да напісання пераказу,
– работа па высвятленню значэння незразумелых слоў,
– работа па навучанню пастаноўцы пытанняў [5, с. 23–42].

Усе вышэйпералічаныя віды работ спрыяюць развіццю мовы і маўлення, зносін і камунікацыі вучняў паміж сабой, яны з лёгкасцю могуць быць выкарыстаны як на ўроках мовы і літаратуры, так і на іншых прадметах школьнага курсу. Для ўсіх гэтых відаў работ як нельга лепш падыдуць творы вуснай народнай творчасці. Варыянты выкарыстання фальклорных твораў пад час рэалізацыі тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання прадстаўлены ў Табліцы 1.

Прадстаўленыя варыянты могуць быць выкарыстаны ў вучэбнай дзейнасці. Аднак тэхналогія калектыўнага ўзаеманавучання як сродак фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі можа быць выкарыстана і ў пазавучэбнай дзейнасці. Праца ў групах дае нам магчымасць выкарыстання народных гульняў, тэатралізацый твораў вуснай народнай творчасці і фрагментаў народных абрадаў.

Табліца 1. – Варыянты выкарыстання фальклорных твораў у тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання

| **Віды работ** | **Творы вуснай народнай творчасці** | **Прычыны выбару** |
|---|---|---|
| Напісанне ўзаемных дыктантаў | Скарагаворкі, прыказкі і прымаўкі, загадкі | Невялікі аб'ём тэксту, лёгкасць запамінання |
| Падрыхтоўка да напісання пераказу | Небыліцы, невялікія казкі, невялікія легенды | Наяўнасць сюжэту, закончанасць дзеяння, невялікі аб'ём тэксту |
| Высвятленне значэння незразумелых альбо невядомых слоў | Загадкі, прыказкі і прымаўкі | Гульнёвая, займальная форма падачы слоў заўсёды лягчэй ўспрымаецца і запамінаецца |
| Навучанне пастаноўцы пытанняў | Скарагаворкі, прыказкі і прымаўкі, небыліцы, загадкі, казкі, легенды, г.д. | Прастата тэкстаў |

Такім чынам, інтэнсіўныя тэхналогіі навучання могуць стаць адным з выніковых сродкаў фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі ў малодшых школьнікаў. Для такой работы падыходзіць тэхналогія калектыўнага ўзаеманавучання, якая дазваляе настаўніку стварыць умовы для эфектыўнага фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі. А выкарыстанне фальклорнага матэрыялу пад час такой работы дае вялікія творчыя магчымасці ў выбары інструментаў для арганізацыі дзейнасці навучэнцаў, што абавязкова надае каштоўнасць працэсу фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі і робіць яго больш займальным і цікавым для малодшых школьнікаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**


1. Литвинко, Ф. М. Коммуникативная компетенция: принципы, методы, приёмы формирования : сб. науч. ст. / Ф. М. Литвинко. – Минск : БГУ, 2009. – Вып. 9. – 102 с.
2. Обучение русскому языку в школе : учеб. пособие для студентов педагогических вузов / Е. А. Быстрова [и др.] ; под ред. Е. А. Быстровой. – 2-е изд., стер. – М. : Дрофа, 2007. – 237 с.
3. Коджаспирова, Г. М. Словарь по педагогике / Г. М. Коджаспирова, А. Ю. Коджаспиров. – М. : МарТ ; Ростов н/Д., 2005. – 448 с.
4. Интенсивное обучение: технологии организации образовательного процесса : практ. руководство / И. В. Шеститко [и др.] ; рец. О. В. Клезович. – Светлая роща : ИППК МЧС Респ. Беларусь, 2014. – 136 с.
5. Шилова, Е. С. Учим радостно, успешно, с интересом и улыбкой. 1–4 классы : метод. пособие для учителей : в 5 кн. : Кн. 1 / Е. С. Шилова. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2017. – 136 с.


УДК 37.016:93(476)

## ТЕХНОЛОГИЯ РЕАЛИЗАЦИИ ИНТЕРАКТИВНОГО МЕТОДА «ЧЬЁ ЭТО?» НА УРОКАХ ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ В УЧРЕЖДЕНИЯХ ОБРАЗОВАНИЯ

*Шилова Елена Савельевна,*
*Институт повышения квалификации и переподготовки*
*Белорусского государственного педагогического*
*университета имени Максима Танка,*
*Минск, Республика Беларусь*
*nigr48@mail.ru*

*Руцкая Людмила Александровна,*
*ГУО «Средняя школа № 187 г. Минска»,*
*Минск, Республика Беларусь*
*Luda.rutskaya@gmail.com*

*В связи с изменением социального заказа общества и государства на выпускника учреждения образования, перед учителем стоит задача – обеспечить каче-*